“Саламяны сонцакруг”
Краіна млыноў, палёў і рамеснікаў

Заслаўскі фэст восеньскага сонца, маляванага неба, саломапляцення, радасці свежага хлеба і местачковых палетак

1 кастрычніка 2023
а 13.30
Этнаграфічныя комплексы “Млын” і “Кузня”

Яшчэ не пайшло лета за далёкія горы на зіму — не сышло сонца ад нас. Бы і не цёпла ўжо — але ж жаўцюткія праменьчыкі грэюць на палетках… Дый птушкі ў вырай яшчэ чарадамі не выправіліся… Бабіна лета… Сонца тут, сонца з намі.

Час такі — час з лета на восень. А за імгненнем ужо ж і восень на зіму паверне… Сумёты дый варажбітыя калядкі хутка…

А пакуль — яшчэ лета на восень… Сонца грэе і нас казыча сваімі ўсмешкамі. Час сустракаць золата новага року жыцця — але ж і час дбаць на будучы рок. Час сеяць хлеб на зіму — каб быў ён налета.

Час свежага хлебу, што руплівая рука сейбіта пакладзе на раллю, а навесну… А навесну будзе новае жыццё!

Спаткайма яго пасля, а пакуль — песні на раллі, скокі з музыкамі, цуды чароўных рук нашых магістраў-майстроў і неверагодныя цікавосткі неўтаймаваных рамеснікаў, і пах — пах новай восені…

Чакайма вас у нашым местачковым скансэне, што ў заслаўскім Запаведніку, у нядзелю 1 кастрычніка.

Ужо ж хутка разам хлебу пашу закладзем — новае жыццё закладзем дый разам яго на карагод павядзем.

Праграму фэсту ўжо днямі ў нашых старонках у сацсетках і на сайце заслаўскага Запаведніка